Пінскі Веснік

2017. – 15 жніўня. – № 65. – С. 6.




*Летняя занятасць*

# Праца і вольны час

**Мы ўжо пісалі пра тое, што сёмага жніўня на базе Палескага ўніверсітэта распачаў дзейнасць студэнцкі будаўнічы атрад.**

Юнакі да гэтага часу паспрабавалі сябе ў якасці ўкладчыкаў тратуарнай пліткі. Хлопцы падзяліліся, што праца гэта нялёгкая, але яны стараюцца заданне выконваць якасна і своечасова.

Акрамя асноўнай работы, арганізатары паклапаціліся і аб вольным часе студэнтаў. Так, напрыклад, на мінулым тыдні яны наведаліся ў боўлінг-клуб і з азартам збівалі кеглі. Плануюць студатрадаўцы прыняць удзел у квэст-гульні ў Музеі Беларускага Палесся.

Па водгуках студэнтаў, яны чарговы раз пераканаліся, што працаваць і цікава бавіць вольны час не толькі не перашкаджаюць адзін другому, а, наадварот, спрыяюць добраму настрою на грамадска-карысны занятак менавіта ў іх вольны ад вучобы час ва ўніверсітэце.

**Ірына ДЗЕНІСОВІЧ.**
**Фота аўтара.**